**Фірыновіч А.Э.**

# ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПА ГІСТОРЫІ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг. З НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА БЕЛАРУСІ

Па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у архівах Рэспублікі Беларусь маецца даволі вялікая колькасць нявыкарыстаных дакументальных матэрыялаў, што адрозніваюцца арыгінальнасцю, навізной і грунтоўнасцю фактуры. Можна вылучыць 5 архівасховішчаў, у якіх змешчаны тэматычныя калекцыйныя зборы: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБГ), Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (АРКР ЦНБ), Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАНБ), Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). Кожная з выяўленых калекцый валодае пэўнай спецыфікай. Так, дакументы НГАБ, НГАБГ выконваюць асноўную інфармацыйную функцыю ў вывучэнні гісторыі паўстання 1863–1864 гг. на беларуска-літоўскіх землях. Факталагічны ж патэнцыял матэрыялаў АРКР ЦНБ, ЦНА НАНБ і БДАМЛіМ складае сістэму гістарычных фактаў не самой падзеі, а працэсу яе даследавання айчыннымі навукоўцамі, чым дазваляюць дапоўніць гістарыяграфію праблемы.

Як вядома, у працы з аб'ёмістым дакументальным комплексам нельга абысціся без яго класіфікацыі. Агульнапрынятым спосабам першапачатковага групавання крыніц з'яўляецца дзяленне іх па форме фіксацыі інфармацыі, г. зн. па знешняй форме крыніцы. У сучасных айчынных, расійскіх і ўкраінскіх крыніцазнаўчых даследаваннях гэтая традыцыя захавалася [2; 3; 8; 18; 19]. У залежнасці ад аўтара і яго пошукавых мэтаў найбольш ужывальнымі з'яўляюцца класіфікацыі Л. Пушкарова і А. Праншэйна, І. Кавальчанкі, С. Шміта. Л. Пушкароў і А. Праншэйн прапанавалі 7 тыпаў крыніц: пісьмовыя, рэчавыя, этнаграфічныя, вусныя, лінгвістычныя, фонадакументы, фотакінадакументы [16; 17]. І. Кавальчанка выдзяліў толькі 4 тыпы: рэчавыя, пісьмовыя, фонадакументы, выяўленчыя (мастацка-выяўленчыя і графічна-выяўленчыя) [7]. Больш падрабязную класіфікацыю па знешняй форме крыніц стварыў С. Шміт. Ён абазначыў наступныя тыпы і падтыпы: рэчавыя, выяўленчыя (мастацка-выяўленчыя, выяўленча-графічныя, выяўленча-натуральныя), моўныя (размова, помнікі вуснай творчасці, пісьмовыя),канвенцыянальныя (знакі, сімвалы–ноты і г. д.), паводзінавыя (звычаі, абрады), гукавыя і аўдыяльныя [19].

Другі ўзровень класіфікацыі засноўваецца на выяўленні відава-родавых асаблівасцей гістарычных крыніц (аналіз унутранай формы) і вызначаецца аўтарскім падыходам. З аналізу дысертацыйных прац апошняга дзесяцігоддзя вынікае, што



Рэпазіторый ВГУ

найбольш папулярнымі з'яўляюцца прадметна-тэматычная [1; 5; 6; 15] і відава-функцыянальная [4; 9]. Сустракаюцца таксама і іншыя прынцыпы падзелу (па паходжанні, жанру, храналогіі, аўтарству і г. д.), што абумоўлена спецыфікай саміх крыніц і тэмай даследавання. Заканамерна, што калі аб'ект вывучэння прадстаўлены адным тыпам крыніц, то перавага надаецца прадметна-тэматычнай класіфікацыі, а калі некалькімі, то відава-функцыянальнай. Ні адзін з даследчыкаў не абмяжоўваецца адным спосабам класіфікацыі. Звычайна прынята даваць некалькі класіфікацыйных сістэм, якія заснаваны на пэўным прынцыпе, характэрным толькі адпаведнай групе дакументаў. Гэта дае магчымасць даць найбольш поўны крыніцазнаўчы аналіз калекцый матэрыялаў, ахапіць усе іх бакі. Відавочна, што ўсе класіфікацыі носяць умоўны характар і прызначаны для зручнасці аб'ектыўнага вырашэння пастаўленай навуковай праблемы.

Зыходзячы з відавай напаўняльнасці сабранага тэматычнага дакументальнага корпусу і яго родава-тыпавой спецыфікі (па спосабу фіксацыі інфармацыі) вылучаюцца наступныя *тыпы* крыніц: а) пісьмовыя; б) выяўленчыя з падтыпамі графічна-выяўленчых (схемы, планы, фотаздымкі) і мастацка-выяўленчых (малюнкі) дакументаў.

Абсалютную большасць складаюць пісьмовыя крыніцы. Па традыцыйна ўсталяванай у гістарычнай навуцы формуле ў іх выяўлены два *роды*: апавядальныя і дакументальныя. На трэцім этапе класіфікацыі (унутрыродавым) найбольш прыймальным крытэрыем выбраны *відавы,* бо, як зазначыла вядучы расійскі крыніцазнаўца В. Медушэўская, "Классификация по видам является наиболее важной, отвечающей главной задаче источниковедения. Источники возникают в целенаправленной человеческой деятельности как облеченные в материальную форму произведения, как средства для достижения той или иной цели, удовлетворения тех или иных общественных, человеческих потребностей. Вот эту цель, эту направленность, назначение произведения и следует положить в основу классификации" [10].

У выніку структура выяўленых крыніц па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. з беларускіх архівасховішчаў выглядае наступным чынам: <u>апавядальныя</u> падзяляюцца на: 1) эпісталярыю; 2) літаратурныя і гістарычныя або ўласна-навуковыя творы; 3) грамадска-палітычную публіцыстыку. Каб падкрэсліць спецыфіку апошняга віду, правядзем яго падзел на дзве падгрупы паводле наступных прынцыпаў: паводле мовы дакумента (рускамоўная і польскамоўная публіцыстыка) і адпаведна паводле аўтарскага паходжання (афіцыйная або ўрадавая і апазіцыйная). <u>Дакументальныя:</u> 1) дакументы афіцыйнага справаводства; 2) заканадаўчая дакументацыя. У сваю чаргу дакументы афіцыйнага справаводства ўнутры віду згрупаваны па функцыянальнаму прызначэнню і прадстаўлены: а) арганізацыйна-распарадчай дакументацыяй; б) дзелавой перапіскай; в) судова-следчымі справамі; г) справаздачнымі дакументамі; д) уліковай; е) пратакольнай; ж) планавай дакументацыяй. Такім чынам, атрымоўваецца трохузроўневая (тып – род – від) лінейная схема класіфікацыі сабранага корпусу дакументаў.

Асаблівай цікавасцю вылучаецца група выяўленчых матэрыялаў, дзе маюць наяўнасць, як адзначалася вышэй, выяўленча-графічныя (фотаздымкі і схемы-праекты) і мастацка-выяўленчыя дакументы (малюнкі). У параўнанні з пісьмовымі крыніцамі вылучанай калекцыі іх колькасць вельмі мізэрная (8 адзінак). Аднак у рамках распараджэння М. Мураўёва, згодна з якім такія матэрыялы бясспрэчна знішчаліся, захаванасць чатырох *фотаздымкаў* з'ява неверагодная. Яны належаць да дакументаў асабістага паходжання і прадстаўляюць выявы недобранадзейных асоб з Варшавы, а менавіта доктара Рыгора Корсака, фартэпіяніста Чарапана, ксяндза Лабенскага [11, арк. 15], а таксама западозранага ва ўдзеле ў паўстанні 1863–1864 гг. выхаванца Санкт-Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута Дзмітрыя Кашына [13]. Першыя тры

Рэпазіторый ВДУ

фотаздымкі, выкананыя ў поўны рост, знойдзены пад час вобшуку ў полацкага двараніна Каспера Кашырскага, што праходзіў па справе садзеяння паўстанню ў Віцебскай губерні. Апошняе фота ў форме анфаснага профілю дадавалася да распараджэння Віцебскага губернатара аб пошуку палітычнага злачынца Кашына. Стан захаванасці фотаздымкаў вельмі добры. Акрамя свайго непасрэднага функцыянальнага прызначэння (зберагчы памяць) яны валодаюць скрытай інфармацыяй (выявы вопраткі, абсталявання, антрапалагічныя асаблівасці), якая з'уляецца цікавай для біяграфістыкі, гісторыі штодённасці і культуры XIX ст.

Незвычайным у сваім родзе з'яўляецца *малюнак*, сюжэт якога быў наступны – аднагаловы белы арол трымае ў кіпцюрах чорнага двухгаловага. Малюнак расклейваўся разам з памфлетам у жніўні 1861 г. на будынках цэнтральных вуліцах г. Пінска. Ён выкананы ў эскізным варыянце. Па сутнасці, акрамя эстэтычнай вартасці, у ім утрымліваецца ідэалагічны напрамак антыўрадавай дзейнасці, які сведчыць пра праявы патрыятычнага настрою, выказаныя моладдзю беларуска-літоўскіх зямель яшчэ задоўга да пачатку адкрытай узброенай барацьбы ў студзені 1863 г. [14, арк. 6]. А таму паводле функцыянальнага прызначэння ўмоўна яго можна залічыць у групу агітацыйнай прадукцыі.

У графічнай форме прадстаўлены *праекты помнікаў* для магілы салдат Інваліднай Горацкай каманды, загінуўшых ноччу 23 красавіка 1863 г. Два першыя праекты М. Мураўёў палічыў дарагімі і па яго грашовых разліках быў сканструяваны і зацверджаны праект помніка № 3, які аформлены не ў выглядзе схемы, а паўнавартасным малюнкам. На чарцяжах змяшчаецца маштабная разметка, што дае магчымасць вызначыць сапраўдныя памеры помніка, а таксама папярэдні баланс фінансавых расходаў на матэрыялы і працу па ўзвядзенню [12, арк. 8, 9, 35]. Гэтая інфармацыя каштоўная не толькі для дэталізацыі гістарычных рэаліяў 1863–1864 гг., але і для гісторыі архітэктуры XIX ст.

Такім чынам, група выяўленчых матэрыялаў вызначаецца пэўнай фенаменальнасцю. Па-першае, такі іх від, як фотаздымкі 1860-х гг., для крыніцазнаўства з'ява вельмі рэдкая. Па-другое, іх інфармацыйны патэнцыял носіць двайную накіраванасць: а) культурную; б) навуковую. Як помнікі мастацтва, яны не проста выконваюць сваю практычную функцыю эстэтычнага задавальнення, але і ўтрымліваюць скрытую факталагічную базу, якая дэталізуе падзеі 1863–1864 гг. на ўзроўні чалавечага светаўспрыняцця, а таксама вызначае новыя прадметы даследавання для сумежных дысцыплін. Зразумела, працэс выяўлення аб'ектыўнай інфармацыі, якая зафіксавана імі незалежна ад усведамлення стваральніка, дастаткова складаны. Аднак неабходна і лагічна выкарыстоўваць яе ў якасці дадатковай асновы пры зборы, дапаўненні, пацвярджэнні фактаў па гісторыі паўстання 1863–1864 гг.


1. Белявский, А.М. Произведения фольклора как исторический источник (на примере ирландских исторических песен): дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / А.М. Белявский. – Минск, 2004. – 134 с.
2. Гурьева, С.А. Типология современной прессы Южной Украины: автореф. дис. ... канд. филологич. наук: 10.01.08 / С.А. Гурьева; Университет им. Т. Шевченко. – Киев, 2006. – 18 с.
3. Еленская, И.Э. Документы немецко-фашистских окупационных органов управления как исторический источник: по материалах Госархива Брестской области: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / И.Э. Еленская; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 1999. – 18 с.
4. Ермалович, В.И. Листовки партизан и подпольщиков Беларуси периода Великой Отечественной войны (1941-1944) как исторический источник: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / В.И. Ермалович; АН, Ин-т истории. – Минск, 1993. – 24 с.
5. Казакова, М.А. Воспоминания об Октябрьской революции 1917 г. в Среднем Поволжье как исторический источник: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / М.А. Казакова; Казанский гос. ун-т им. В.И. Ульянова-Ленина. – Казань, 1994. – 21 с.


Репозиторий ВГУ

6. Кан, В.С. Становление и развитие газетной периодики Тувы (1921-1985): исторический анализ: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / В.С. Кан; Омский ун-т гуманитарных исследований им. Ф. Достоевского. – Омск, 2007. – 22 с.
7. Ковальченко И.Д. Методы исторического исследования / И.Д. Ковальченко. – М.: Наука, 1987. – 439 с.
8. Магидов, В.М. Кинофотофонодокументы: проблемы историографии, архивоведения и источниковедения: автореф. дис. ... док-ра ист. наук: 07.00.09 / В.М. Магидов; Российский гуманитарный университет. – М., 1993. – 36 с.
9. Маркевич, А.М. Солдатские письма в Центральные советы как источник для изучения общественных настроений в армии в 1917 г.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.09. / А.М. Маркевич; Ин-т рос. истории РАН. – М., 2002. – 26 с.
10. Медушевская, О.М. Источниковедение: Теория, История, Метод / О.М. Медушевская // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.opentextnn.ru/history/istochnik/meduschevskaja. – Дата доступу: 06.12.2012.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Мінск) (далей НГАБ). – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31521.
12. НГАБ. – Ф. 2001. – Воп. 2. – Спр. 84.
13. НГАБ. – Ф. 2500. – Воп. 1. – Спр. 341.
14. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1435.
15. Павлов, Д.Г. Нижнегородские исторические песни как исторический источник: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07. 00. 09. / Д.Г. Павлов; Арзамасский гос. ун-т им. А.П. Гайдара. – Нижний Новгород, 2006. – 31 с.
16. Пронштейн, А.П. Методика исторического источниковедения / А.П. Пронштейн. – Рн/Д.: Из-во Ростовского университета, 1976. – 480 с.
17. Пушкарев, Л.Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории / Л.Н. Пушкарев. – М.: Наука, 1975. – 281 с.
18. Соловьева, Г. Материалы Российского государственного архива о лютеранских приходах Северо-Западной Росси XVIII – начала XX веков как исторический источник: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.09 / Г. Соловьева; СПб-й гос. ун-т. – СПб., 2008. – 24 с.
19. Ходин С.Н. История и теория источниковедения: учебное пособие / С.Н. Ходин, В.П. Грицкевич, С.Б. Каун. – Минск: Изд. центр БГУ, 2008. – 254 с.
20. Штакельберг, Ю.И. Фонды личного происхождения в хранилищах Советского союза как источник для изучения восстания 1863 г.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.09 / Ю.И. Штакельберг; АН СССР, Ин-т славяноведения. – М., 1967. – 21 с.

Репозиторий ВГУ